янальна–адраджэнскага руху, ня будзе на'т нацыянальнага жыцьця. А без свае друкарні, калі друк і пачнецца, дык не разаўецца, бо мусім шмат пераплачаваць чужым друкарням. Прыкладам, за бачыну друку аднаго формату бяруць друкарні ў Ню–Ёрку ня меней 6–х даляраў, а складаньнік на лінотыпе бярэць за шасьцігадзінны рабочы дзень 19 дал. 20 ц. і складае за гэткі дзень 24 такія бачыны, значыцца, самой друкарні бачына абходзіцца 80 ц.

Мы маем магчымасьць купіць малую друкарню, бо часьць нас мае невялічкія ашчаднасьці. Іх стане на куплю друкарні. Аплаціцца таксама ўжыць іх на гэта, бо, паложаныя ў банк яны даюць толькі 2%, а друкарня дасьць ужо із самага пачатку болей, а пасьлей і шмат разоў болей.

Невялічкая друкарня, маючая лінотып для кірылічнага й лацінскага тэксту, даволі такога–ж ручнога шрыфту, некаторыя малыя машыны і інш., — адным чынам, такая друкарня, што зусім здаволіць нашыя беларускія патрэбы ды яшчэ можа спаўняць шмат чужых заказаў, будзе каштаваць ад 3000 да 4000 дал.

Выглядае, што найляпей дзеля куплі друкарні закласьці акцыйную супалку, выпушчаючы акцыі да 4000 дал. Акцыі маглі–б быць па 10 дал. кажная, але пажадана, каб жадаючыя мець сваю друкарню бралі больш як па аднэй, а на'т па 10 і болей акцыяў. Ужо цяпер ё задакляраваных каля траціны патрэбнай сумы на куплю друкарні.

Просім усіх, хто хоча прычыніцца да гэтай асабіста карыснай, а ідэйна важнай справы, напісаць Ініцыятыўнай групе, на якую суму ён возьме акцыяў беларускай акцыйнай супалкі друкарскай. Пісаць на гэткі адрыс: J. Stankievich, 6 Vandervoort Place, Brooklyn 6, New York.

# Вайна ў Карэі

„Веда“ ё часапіс навукова–літаратурны. Але ё надзвычайныя здарэньні вонках навукі й літаратуры, на якія нам нельга не адгукнуцца. Адным ізь іх ёсьцека вайна ў Карэі. Комуністычная Расія загадала скомунізаваным ёю паўночным Карэйцам напасьці на дэмократычную паўдзённую рэспубліку карэйскую. Карэйскія комуністыя маюць вялікую, далёка перавышаючую іхныя собскія сілы, памогу расійскую, як беспасярэднюю, так і пры помачы Кітайцаў. Запраўды на карэйскім адрэзку вядзецца вайна паміж нявольным сьветам камуністычнай Масквы і яшчэ вольным сьветам Задзіночаных Народаў, з боку каторых галоўна ваююць Задзіночаныя Гаспадарствы Амэрыкі. У даную часіну Амэрыка перамагае, і калі Масква не пашлець на гэтую вайну яшчэ балей кітайскіх гордаў, дык за колькі месяцаў вайна скончыцца перамогаю вольнага сьвету.

Перад выхадам „Веды“ комуністычны Кітай умяшаўся ў вайну, пасылаючы ў Карэю паў мільёна войска.

Крывічы–Беларусы, як старыя, так і новыя Амэрыканцы, пакліканыя — уладамі Задзіночаных Гаспадарстваў Амэрыкі — на вайну, маюць лёяльна й шчыра споўніць сваю павіннасьць, ведаючы, што вайна йдзець із Масквою, гэтым найгоршым ворагам іхнае старое бацькаўшчыны Беларусі і новае Амэрыкі.

А калі пачнецца спадзяваная сьветная вайна, значыцца, і ў Эўропе, і ў Беларусі, дык ня будзе такога Беларуса, каторы–бы не пайшоў туды вызваляць із маскоўскага пекла сваю дарагую бацькаўшчыну і ейных дзяцей.

# Іміграваньне беларускіх ДП у ЗГА

Другой надзвычайнай справаю, на якую кажны Крывіч мусіць адгукнуцца, ё справа перасяленьня крывіцкіх або, накш, беларускіх ДП з Эўропы, галоўна зь Нямеччыны й